ВОЛЬНЫЙ ТРУД
Белосток
24 ИЮЛ. 40 г.

3116

# Да гастроляў польскага дзяржаўнага тэатра БССР у Беластоку

26 ліпеня ў беластоцкім гарадскім тэатры пачне гастролі польскі тэатр БССР пад кіраўніцтвам Александра Венгерка.

Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі расце і штодзённа ўмацоўваецца брацкая дружба народаў усіх нацыянальнасцей, якія насяляюць нашу краіну. Толькі ў краіне Советаў створаны ўсе ўмовы для свабоднага развіцця соцыялістычнай культуры ўсіх нацыянальнасцей.

Яркім прыкладам развіцця соцыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме культуры служыць арганізацыя польскага дзяржаўнага тэатра Беларусі. За кароткі час свайго існавання тэатр даў рад спектакляў працоўным горада Гродна і Пінска. Выступленне тэатра мела выключны поспех.

Няма сумнення, што гледачы Беластока ў другі раз цёпла сустрэнуць кожную пастаноўку тэатра. Дзяржаўны польскі тэатр Беларусі пакажа беластоцкаму гледачу класічныя спектаклі: «Каварства і каханне» Шылера ў пастаноўцы Александра Венгерка, п'есу «Пігмаліён» Бернарда Шоу, класічную камедыю Александра Фрэдро «Пажыццёвае», дзе ў галоўнай ролі выступае папулярны артыст-комік Яцэк Вашчыровіч, і камедыю Запольскай «Мараль пані Дульскай» у пастаноўцы рэжысёра В. Чэнгеры.

Сваё двухмесячнае прабыванне ў Беластоку тэатр скарыстае для далейшай рэпертуарнай работы. У перыяд гастролей тэатр падрыхтуе і пакажа працоўным Беластока сваю прэм'еру — совецкую п'есу «Аптымістычная трагедыя» вядомага совецкага пісьменніка - ордэнаносца Всевалода Вішнеўскага.

І. Безручэнка.

Намеснік адказнага рэдактара
Г. М. КУЗНЯЦОЎ.